■ Творчы працэс

# «ПРАВІНЦЫЯ — НЕ МЕСЦА ЖЫХАРСТВА, А СПОСАБ МЫСЛЕННЯ», –

## так лічыць Людміла Хмяльніцкая, адна з гераінь кнігі «Сустрэчы без абцасаў»

**У Віцебскай абласной бібліятэцы адбыўся творчы вечар гісторыка Людмілы ХМЯЛЬНІЦКАЙ. Распачаўся ён прэзентацыяй кнігі журналісткі газеты «Звязда» Надзеі Дрылы «Сустрэчы без абцасаў».**



*Сімвалічна, што чарговая прэзентацыя «Сустрэч без абцасаў» прайшла ў межах творчага вечара Людмілы Хмяльніцкай, бо яна — адна з гераінь кнігі. Журналістка расказала, як аўтарскі праект, што нарадзіўся на старонках «Звязды»,ператвараецца ў асобнае выданне. А таксама — як правілы жыцця «моцных» жанчын паўплывалі на яе ўласны лёс, дапамаглі зверыць стрэлкі жыццёвага компаса. Перш чым перадаць слова гераіні вечара, Надзея зачытала невялікі ўрывак з інтэрв'ю з Людмілай Хмяльніцкай, які ўвайшоў у кнігу. «Працэс творчасці часта ўступае ў канфлікт з побытам. Самы пік маёй неарганізаванасці: калі пісала цудоўны тэкст пра Шагала, яго зносіны ў 1913 годзе з французскімі паэтамі-авангардыстамі Гіёмам Апалінэрам і Блезам Сандрарам, і не прыкмеціла, як затапіла суседзяў. Фактычна я была дома, хадзіла там, але не бачыла, што ў мяне пральная машына вылівае ўсю ваду міма. Суседзі мяне, на жаль, не зразумелі, калі я сказала, што была ў 1913 годзе...».*

*Гэтая бытавая замалёўка вельмі яскрава характарызуе Людмілу Хмяльніцкую, як чалавека, захопленага сваёй справай. Падчас сустрэчы яна расказала яшчэ некалькі асабістых гісторый, звязаных з выхадам сваіх краязнаўчых выданняў.*

«...ШМАТ гадоў таму Францыска Рогер даслала мне артыкул пра нашу зямлячку Ганну Тумаркіну — першую ў Еўропе жанчыну-дацэнта. Мы змясцілі яго ў адным з нумароў «Віцебскага сшытка» (краязнаўчы часопіс, рэдактарам якога з 1995 года з'яўляецца Людміла Хмяльніцкая. — **Аўт.**). Гэта была сенсацыя. Праз нейкі час адна мінская журналістка даведалася, што ў гістарычным цэнтры Берна ў гонар Тумаркінай перайменавалі вуліцу. З вялікай цяжкасцю яна знайшла Францыску Рогер (у якой ёсць кніжка на нямецкай мове пра ўсіх выпускніц Бернскага ўніверсітэта) у Берне, спісалася з ёй і папрасіла: «Дайце, калі ласка, інфармацыю пра нашу зямлячку». На што атрымала адказ: «А пачытайце «Віцебскі сшытак». Там усё ёсць».

Наш часопіс выходзіў невялікім накладам. Таму ма́ю прапанову. Калі ў вас ёсць магчымасць выкласці тэксты, якія друкаваліся ў ім, у электронным варыянце на сайт бібліятэкі, то гэта было б цудоўна». — «Калі аўтары і вы дазваляеце бібліятэцы гэта зрабіць, будзем толькі рады», — сказала **Ларыса РАГАЧОВА, загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Віцебскай абласной бібліятэкі.**

«ГАЗЕТА «Віцьбічы» колькі гадоў таму надрукавала карту Віцебска 1904 года, — працягвае Людміла Хмяльніцкая. — Яе наклад разляцеўся імгненна, таму Сяргей Рублеўскі прапанаваў зрабіць перавыданне. Гэтае пытанне якраз і абмяркоўвалася на пасяджэнні археаграфічнай камісіі ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці. «Добра было б, каб да гэтай карты быў нейкі тлумачальны тэкст», — прапанавала я. Рублеўскі сказаў: «Выдатная ідэя. Вось ты і зробіш». Так з'явілася мая кніга «Прагулкі са старой картай», якая карыстаецца вялікай папулярнасцю. Я цешуся, што людзі з задавальненнем вандруюць пры дапамозе віртуальнай карты па тым, ранейшым, Віцебску».

«ПАРАЛЕЛЬНА працую над некалькі матэрыяламі. Гэта нармальна: стамляешся ад адной тэмы — пераключаешся на другую. Зараз рыхтую вялікую кніжку пра Аляксандра Рыпінскага. Гэта наш фалькларыст, фатограф, пісьменнік, паэт. Беларусы пра яго ведаюць вельмі мала. У Нацыянальнай бібліятэцы ёсць толькі ксеракопія адзінай яго кнігі «Беларусь», якая выйшла ў 1840 годзе ў Парыжы. І па сутнасці ніхто не ведае, калі ён памёр і дзе. Мне зноў-такі пашчасціла: я знайшла метрычны запіс у кнізе віцебскага касцёла пра ягоную смерць. Там не толькі дата і прычына сыходу, але і звесткі пра тое, дзе ён быў пахаваны і хто застаўся пасля яго.

Шукала праз інтэрнэт звесткі пра Сар'ю і натрапіла на амаль 300 фотаздымкаў з сядзібы Беліца Сенненскага раёна, якая належала роду Свяцкіх. Не магла прайсці міма. Таксама, думаю, можа атрымацца неблагая кніга.

Не пакідае мяне і Шагал. Вялікія задумкі, бясконцыя. Некалькі гадоў таму выйшла мая кніга «Марк Шагал і Віцебск», дзе апісаны віцебскі перыяд жыцця мастака. Відавочна, што наступная павінна быць «Бэла Шагал і Віцебск». Гэтая постаць усё больш і больш прыцягвае маю ўвагу. Усе ведаюць, што першая жонка Шагала была музай, натхняльніцай. Але гэта толькі агульныя фразы. А хто такая Бэла? Што яна сабой уяўляла як чалавек? Прыйшоў час вывесці жонку мастака з ценю...»

ЛЮДМІЛА Хмяльніцкая бярэ ў рукі кнігу «На Белай Русі ў Сар'і», прысвечаную шляхецкаму роду Лапацінскіх.

«Чаму ўзялася за гэтую тэму? На той час я працавала ў рэстаўрацыйнай майстэрні ў Віцебску. Мы атрымалі заказ на рэстаўрацыю парку ў вёсцы Сар'я Верхнядзвінскага раёна. Я збірала па архівах звесткі. Куды ні прыеду, нідзе не знаходжу матэрыялаў пра парк. Пра касцёл ёсць, пра маёнтак ёсць, пра Лапацінскіх ёсць. А пра парк нічога. Потым, калі паехала ў тую Сар'ю, калі падышла да касцёла, была так уражана яго прыгажосцю! На мой погляд, гэта найлепшы помнік неаготыкі ў Беларусі, які захаваўся! У той жа момант вырашыла: я не магу пра яго не напісаць. Пачала збіраць звесткі і здарыўся цуд. Я знайшла не толькі імя архітэктара (для помнікаў архітэктуры Беларусі, на жаль, вялікая рэдкасць — даведацца імя архітэктара), але і нават імёны муляраў, што рабілі кладку гэтага касцёла. І ўсе падрабязнасці гэтай гісторыі. І потым высветлілася, што Лапацінскія, якія там жылі і пабудавалі гэты касцёл, вельмі любілі трапляць на старонкі дзённікаў сваіх сучаснікаў. Гэтыя жыццёвыя ўспаміны пра Лапацінскіх таксама ўвайшлі ў кніжку. Цяпер працую над другім выданнем, якое будзе разы ў 2-3 таўсцейшае, чым гэтае.

Зараз значна палепшылася сітуацыя з даступнасцю крыніц. Апроч кніг XVIII–XIX стст., якія ёсць у адкрытым доступе, архівы таксама выкладаюць матэрыялы (нават метрычныя кнігі фондаў) на сваім сайце. Ужо не трэба збіраць грошы, каб паехаць у Пецярбург, Маскву, Рыгу. Можна пакапацца ў архіве не выходзячы з дому. Інтэрнэт сцёр межы, сёння ўсё роўна, дзе ты жывеш: у Мінску, у Парыжы ці ў Віцебску. Доступ да інфармацыі аднолькавы. Усё залежыць выключна ад твайго жадання. Правінцыя цяпер — гэта не месца жыхарства, гэта спосаб мыслення. Мне б хацелася, каб пры такой базе больш актыўна праяўляла сябе моладзь, якая, карыстаючыся гэтымі магчымасцямі, пісала б сур'ёзныя работы. Каб тут, у бібліятэцы, было больш сустрэч з іншымі краязнаўцамі».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК**

# У НАС НЕ КУРАЦЬ



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Скажам, больш за 90 працэнтаў гараджан выступаюць за забарону курэння на дзіцячых пляцоўках і ў грамадскім транспарце, больш за 80 — на тэрыторыях і ў памяшканнях арганізацый аховы здароўя, спорту, адукацыі, культуры. Пазбавіць кавярні, бары і рэстараны ад тытунёвага дыму жадаюць больш за палову рэспандэнтаў.

Праўда, пры гэтым усяго каля паловы падтрымлівае забарону курэння на працоўных месцах і ў цягніках далёкага накіравання. Дзесьці палова насельніцтва лічыць, што адказнасць за парушэнне забароны курэння павінны несці самі парушальнікі-курцы, 40 працэнтаў мяркуюць, што адказнасць павінна падзяляцца разам з уладальнікамі-арандатарамі памяшканняў, і 7 працэнтаў адзначылі, што адказнасць ускладаецца выключна на ўладальнікаў.

Вынікі даследавання прадэманстравалі таксама падтрымку жыхарамі іншых эфектыўных мер па скарачэнні курэння: уведзеную з 1 ліпеня мінулага года забарону выкладваць тытунь у месцах продажу і павышэнне цэн на цыгарэты. Павышэнне цэн найбольшую падтрымку знаходзіць, зразумела, сярод былых курцоў і тых, хто не курыць, а вось больш за ўсіх супраць маладыя людзі.

«Варта нагадаць, што ўжо ўступіў у сілу Тэхнічны рэгламент на тытунёвую прадукцыю ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза, і цягам года Беларусь павінна забяспечыць на пачках цыгарэт наяўнасць надпісаў-папярэджанняў памерам да паловы плошчы пачка і адпаведнага зместу на ім малюнкаў і карцінак, якія будуць дэманстраваць наступствы курэння, — кажа **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Людміла НАРОЙЧЫК.** — Застанецца таксама нагадванне аб тым, што цыгарэты змяшчаюць мутагенныя і канцэрагенныя рэчывы, аднак іх колькасць пазначацца не будзе, каб не ствараць у спажыўца ілюзію большай ці меншай шкоды».

Паводле інфармацыі Міністэрства гандлю, апошнія праверкі ўстаноў гандлю не выяўляюць парушэнняў выкладкі такога тавару. У цэлым з 2013 года назіраецца зніжэнне вытворчасці тытунёвых вырабаў (з 2010-га па 2013-ты быў рост). Узровень вытворчасці ў 2015-м склаў 83,4 працэнта да ўзроўню 2014-га. У першым квартале гэтага года, праўда, адбылося павелічэнне да адпаведнага ўзроўню 2015-га — 103 працэнты. Падае і імпарт цыгарэт — ён склаў летась 57 працэнтаў да ўзроўню папярэдняга года. Трэба мець на ўвазе, што імпарцёр-манапаліст пастаўляе на рынак сегмент пераважна дарагіх цыгарэт. Адпаведна, калі ў 2010–2012 гадах адзначаўся рост спажывання падобнай прадукцыі, то ў 2015-м мела месца зніжэнне (на 2 млрд штук менш, чым у 2010-м).

— 21 працэнт беларусаў не згодны наведваць рэстараны і бары, дзе не кураць, але ж 60 працэнтаў — горача «за», і гэта ўжо добра. Людзі едуць за мяжу і бачаць, што цыгарэты выйшлі з моды, а таму ўсё большая колькасць пачынае разумець, што і ў сваёй краіне можна наведваць рэстаран і не атручваць сябе, — разважае **старшыня праўлення Міжнароднай канфедэрацыі таварыстваў спажыўцоў краін СНД Дзмітрый ЯНІН.** — Яшчэ не ўсе да канца ўсвядомілі, што такое неабходнасць забароны курэння ў цягніках далёкага накіравання, і ім трэба патлумачыць, што гэта, мякка кажучы, некамфортна — ехаць у вагоне на 36 чалавек, тым больш калі тваё месца ля дзвярэй, і пастаянна, нават ноччу, слухаць перасоўванні курцоў. Дый і ад дыму ўсё роўна нікуды не падзецца, нават калі яны спрабуюць выходзіць у тамбур... Як жа інтарэсы тых, хто не курыць?

У Расіі, дарэчы, вытворчасць цыгарэт зніжаецца ў апошнія гады на 10 працэнтаў за год. Гэта вельмі добра, бо ратуе жыццё. У Расіі ад захворванняў, звязаных з тытунём, штогод гіне не менш за 300 тысяч чалавек. Цікава, што даходы бюджэту ад прынятых забаронных мер не зменшыліся, бо планава павышаліся акцызы на тытунь. Абарот грамадскага харчавання летась таксама не знізіўся. Хоць многія спачатку гаварылі, што цыгарэты неаддзельныя з атмасферай бараў і пабаў, таму апошнія проста пазачыняюцца. Аднак статыстыка паказвае, што колькасць устаноў грамадскага харчавання вырасла, ніякага масавага зыходу з гэтага бізнесу не адбываецца. Як не адбылося і ў іншых краінах, дзе забаранілі курэнне ў сферы грамадскага харчавання — Вялікабрытаніі, Аўстраліі і іншых. Да ўвядзення забароны ў 2013-м толькі 76 працэнтаў расіян падтрымлівалі забаронную практыку, летась «за» было ўжо больш за 80. Значыць, людзі ўдзячныя за такія захады. Нават самі курцы ўжо разумеюць, што несправядліва абкурваць афіцыянтаў, супрацоўнікаў і блізкіх...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Адны праблемы

**Член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый БАРАДЗЕНЯ:**

— Павышэнне эфектыўнасці дзяржаўных мер па павелічэнні працягласці жыцця знаходзіцца ў руках саміх людзей. П'янства, курэнне, малярухомы лад жыцця ўплываюць, па словах заходніх экспертаў, у значна большай ступені, чым развіццё сістэмы аховы здароўя. Калі ты сам не хочаш быць здаровым, то медыкі тут, што называецца, бяссільныя. Забарона выкладкі, на маю думку, выдатная мера, бо мяне, як чалавека, які не курыць, проста раздражнялі створаныя курцамі чэргі ля касы. Чаму я павінен стаяць і назіраць, як нехта разважае, які пачак яму выбраць? А ў чарзе гэтай стаяць і дзеці, вымушаныя назіраць гэтае шоу... Грамадства не павінна падтрымліваць ні курэнне, ні працэс яго набыцця. Выдатна, што і ў сталіцы забаронена курэнне на тых жа прыпынках — трэба абараняць тых, хто не курыць і каму дым наогул процілаказаны — дзяцей і цяжарных. Бары і рэстараны таксама павінны думаць аб правах тых, хто не курыць. Акцызная, цэнавая палітыка ў нас узгоднена з ЕАЭС, і гэта важна. І, дарэчы, цалкам апраўдана, калі мець на ўвазе, што ў нас не страхавая медыцына, а тытунь стварае сур'ёзныя праблемы для нашай аховы здароўя. Хоць цэны ў нас не з'яўляюцца ўсё яшчэ неверагодна высокімі. Я памятаю, як цыгарэты атаясамлівалі з нейкім шармам, але сёння мы павінны паказаць, што гэта адны праблемы і злачынства супраць здароўя.